# ФІЛАСОФСКАЯ ТЭРМІНАЛОГІЯ ПЕРЫЯДУ РАННЯГА ХРЫСЦІЯНСТВА (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРАЎ ЛАКТАНЦЫЯ)

**Котава М. А.**

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны даследаванню выкарыстання філасофскай тэрміналогіі ў перыяд ранняга хрысціянства на прыкладзе твораў Лактанцыя, рымскага і хрысціянскага пісьменніка IV стагоддзя. Аналіз яго ключавых твораў, такіх як «Боскія ўсталяванні» і «Пра смерць праследавацеляў», дазваляе прасачыць узаемадзеянне раннехрысціянскай думкі з антычнай філасофіяй. У артыкуле даследуецца выбар філасофскіх тэрмінаў Лактанцыем і іх інтэрпрэтацыя ў кантэксце раннехрысціянскай дактрыны.

**Ключавыя словы**: Лактанцый, тэрміналогія, corpus, ratio, animus, natura, religio.

Пытанне аб вызначэнні месца грэчаскай і рымскай філасофіі ў гісторыі культуры было адным з найбольш вострых і складаных у палеміцы хрысціянскіх апалагетаў II–IV стст. з язычнікамі. Яны ж і ставілі пытанні аб тым, ці абгрунтаваныя прэтэнзіі паганскай філасофіі на адкрыццё калі не ісціны ў цэлым, то нейкай яе часткі, ці патрэбна наогул філасофія, ці неабходная хрысціяніну мудрасць інтэлектуалаў мінулага, якія нічога не ведалі пра Хрыста. Адказы на гэтыя пытанні ў выніку фармавалі хрысціянскі погляд на гісторыю культуры і філасофіі ў цэлым, а таксама вызначылі вядомую ступень выкарыстання дасягненняў грэка-рымскай філасофіі ў сярэднявечнай еўрапейскай культуры.

Адным з такіх апалагетаў з’яўляўся і Лактанцый. Ён быў адным з тых раннехрысціянскіх інтэлектуалаў, якія падчас крытыкі апанентаў праяўлялі дастатковую цярплівасць адносна філасофскіх школ і філасофіі ўвогуле. Ён аддаў шмат часу аналізу антычный філасофіі і прысвяціў гэтаму асобную кнігу. У выніку ў Лактанцыя атрымалася стварыць даволі суцэльную карціну гістарычнага шляху, пройдзенага антычнай філасофіяй.

У сваім творы «De opificio dei» («Аб боскай воли») амаль з самага пачатку Лактанцый спасылаецца на філосафаў: philosophi nostrae sectae – «філосафы нашага вучэння» [7, 0010A] (тут і далей пераклад на беларускую мову наш – М. К.), чым і падкрэслівае асноўную ідэю твора – абвяржэнне матэрыялістычнага вучэння Эпікура і Лукрэцыя. Ён звяртаецца лацінскім словам philosophi, чаго ніколі не рабіў Лукрэцый, які

не карыстаўся словам з грэчаскім корнем і ўвогуле згадваў свайго настаўніка і другіх філосафаў толькі некалькі разоў.

Лактанцый ужывае два філасофскіх тэрміны: «цела» і «розум»: sed ea quae dico, ad mentem referenda sunt, non ad **corpus**, cuius omnis **ratio** ideo comparata est, ut animo tanquam domino serviat, et regatur nutu eius. («але тое, што я кажу, павінна адносіцца да душы, а не да **цела**, увесь **розум** якога так быў падрыхтаваны, каб духу быццам гаспадару служыць, і кіруецца яго воляй») [7, 0012A].

Лацінскае слова «corpus» мае ў Лактанцыя адрознае значэнне ад эпікурэйцаў. Для Лукрэцыя гэта цела фізічнае, непадзельнае, якое складаецца з атамаў, але для Лактанцыя гэта чалавечае тела, у якім заключана душа і думкі чалавека, развяжанні. Лактанцый для вызначэння паняцця розуму карыстаецца іншым словам – «ratio», на месцы якога ў Лукрэцыя знаходзіцца «mens».

Апалагет доўга разважае аб тым, што ёсць душа і чаму яна – лепшая абарона, прыводзячы аргументы, чаму чалавеку больш пашанцавала атрымаць унутраную абарону, а не знешнюю, як жывёлам, а трохі пазней у творы разважае пра падзельнасць душы, ці дзеліцца яна на часткі і дзе яна знаходзіцца ў целе. Аб усім гэтым ён піша, карыстаючыся паняццем «animus».

Лактанцый абазначае прыроду тым жа словам «natura», што ёсць у Лукрэцыя ў назве твора. Ён выкарыстоўвае з усіх варыянтаў менавіта гэты, можа, таму што тэрмін замацаваўся і стаў распаўсюджаным, ці Лактанцый планаваў спаслацца на філосафа ў дакор яму і, каб зрабіць гэта празрыстым, ужыць лексему з назвы твора Лукрэцыя: Cum enim Deus animal, quod fecerat, sua sponte ad mortem transire cognovisset, ut mortem ipsam, quae est dissolutio **naturae**, capere posset, dedit ei fragilitatem, quae morti aditum ad dissolvendum animal inveniret. – «Паколькі Бог ведаў, што створаная ім жывёла ідзе да смерці сама па сабе, каб мець магчымасць прыняць саму смерць, якая ёсць распад **прыроды**, ён даў ёй слабасць, якая магла б адкрыць шлях да смерці для распаду жывёлы» [7, 0020C].

Цікавасць Лактанцыя да паняцця «religio» была абумоўленая галоўным чынам тым, што ён, актыўна палемізуючы з паганскімі вераваннямі, паспрабаваў прадставіць у сваіх працах больш ці менш поўны крытычны агляд «ілжывай» «рэлігіі багоў» («religio deorum»), а таксама паганскай філасофіі, якую ён (часам вельмі праніклівa) звязваў з паганскай рэлігіяй.

Даследаванні, якія Лактанцый праводзіў у гэтым кірунку, дапускалі пераасэнсаванне антычнага разумення тэрміна «religio» і інтэрпрэтацыю яго ў новым, хрысціянскім сэнсе, а таксама пастаноўку пытанняў аб прыродзе і паходжанні рэлігіі.

Перш за ўсё, варта адзначыць, што ў сваіх «Боскіх усталяваннях» Лактанцый адмовіўся ад вядомай этымалогіі Цыцэрона, узвёўшы «religio» да «religare» («звязваць»): «Мы злучаныя і звязаныя (religati sumus) гэтымі вузамі пабожнасці (pietas) з Богам, з-за чаго і сама Рэлігія атрымала сваё імя, а не ад слова «перачытваць» (relegere), як тлумачыў Цыцэрон» [6, с. 137].

Некалькімі радкамі ніжэй Лактанцый развіў гэтую думку, прапанаваўшы нешта накшталт этымалагічна арыентаванага вызначэння рэлігіі: «мы кажам, што імя рэлігіі паходзіць ад тых вузаў пабожнасці (pietas), якімі Бог прывязаў (religaverit) да сябе чалавека, і мы павінны служыць Яму як спадару і пачытаць як Айца» [1, с. 376]. Такім чынам, рэлігія – гэта тое, што звязвае чалавека і Бога «вузамі пабожнасці».

Можна адзначыць дзве істотныя рэчы. Па-першае, выбудаваная Лактанцыем апазіцыя «religio Dei – religio deorum» спрыяла фарміраванню ўяўлення аб асаблівай «рэлігіі язычнікаў». Некалькі пазней гэтая асаблівая рэлігія была канцэптуалізаваная ў паняцці «paganismus», якое ў самога Лактанцыя не сустракаецца.

Па-другое, характэрнай рысай «Боскіх усталяванняў» Лактанцыя з'яўляецца тое, што аўтар даволі рэдка выкарыстоўвае ключавы для хрысціянскай тэалогіі тэрмін «вера» і не звязвае яго з рэлігіяй. Цяжка казаць, чым абумоўлена апошняя рэч, але, магчыма, у дадзеным выпадку на Лактанцыя паўплывала антычная філасофская традыцыя, прадстаўнікі якой, кажучы аб рэлігіі або пра багоў, амаль ніколі не выкарыстоўвалі паняцце «вера» і аддавалі перавагу тэрмінам, звязаным з веданнем. Падобным чынам у Лактанцыя «набожнасць» (pietas), роўна як і «мудрасць» (sapientia), – гэта хутчэй веданне Бога, чым вера ў яго – таму як з першай, так і з другой звычайна карэлююць тэрміны, якія адносяцца да галіны ведаў і разумення, такія як «notitia», «notio», «cognitio», «intellectus», «intelligentia» і г.д.

Зрабіўшы агляд, можна зрабіць выснову: у трактоўцы тэрміна «religio» Лактанцый значна адхіліўся ад папярэдняй антычнай традыцыі. Ён прапанаваў новую этымалогію гэтага слова, узвёўшы яго да «religare» і, адпаведна, да сувязі паміж чалавекам і Богам. Акрамя таго, можна

заўважыць, што ён паспрабаваў развіць і паглыбіць антычныя ўяўленні аб рэлігійнай прыродзе чалавека.

Такім чынам, Лактанцый, ствараючы раннехрысціянскую філасофскую тэрміналогію, карыстаецца наступнымі тэрмінамі: corpus (цела), ratio (розум), animus (душа), natura (прырода), religio (рэлігія). Гэтыя словы ў многім звязаныя з паганскай філасофіяй ранейшых часоў і ствараюць свайго рода мост паміж тэрміналогіяй дахрысціянскіх філосафаў і філосафаў позняй Антычнасці, Сярэднявечча і Рэнесанса.

## ЛІТАРАТУРА


1. Лактанций. Божественные установления. Книги I-VII / Пер. с лат., вступ. ст. В. М. Тюленева. (Серия «Библиотека христианской мысли. Источники»). СПб.: Издательство Олега Абышко, 2007. – 512 с.
2. Лактанций. О творении Божием. О гневе Божием. О смерти гонителей. Эпитомы Божественных установлений / Пер. с лат., вступ. ст., коммент. и указатель В.М. Тюленева. – СПб. : Издательство Олега Абышко, 2007. – 256 с.
3. Скворцов, К. И. Философия Отцов и учителей Церкви в первые три века [Электронный ресурс] – Режим доступа: – https://azbyka.ru/otechnik/Konstantin_Skvorcov/filosofija-ottsov-i-uchitelej-tserkvi/13. – Дата доступа: 13.01.2025.
4. Словарь философских терминов / Под. ред. И. Т. Фроловой, В. Я. Горбачева. – М.: Международные отношения, 2011. – 496 с.
5. Соколов В. С. Историческая концепция Лактанция / Вопросы античной литературы и классической филологии // Отв. ред. М. Е. Грабарь-Пассек. М.: Наука, 1963. – С. 330–345.
6. Цицерон. Философские трактаты / Пер. с лат. и коммент. М. И. Рижского. М.: Наука, 1985. – 382 с.
7. Lactantius. De opificio Dei / CSEL // Eds. S. Brandt, G. Laubmann. T. 27. Vien, 1893. – 320 с.
8. Lactantius. Divinae Institutiones / CSEL // Ed. S. Brandt. T. 19. Vien, 1890. – 761 с.